УДК 63: 001 (476.6)

# СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫЯ КУРСЫ Ў СІСТЭМЕ АГРАРНАЙ АДУКАЦЫІ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ НА ПАЧАТКУ XX СТ.

**Радзюк А.Р., Галубовіч В.У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Да пачатку XX ст. тэрыторыя Гродзенскай губерніі была адным з нешматлікіх рэгіёнаў Расійскай імперыі, дзе справа сельскагаспадарчай адукацыі цалкам ігнаравалася як цэнтральнымі, так і мясцовымі ўладамі. Прычыны падобнага стаўлення да вызначанай праблемы неабходна шукаць, у першую чаргу, у палітычнай сферы. Паколькі пасля паўстання 1863 г. царызм не давяраў мясцоваму насельніцтву, то гэта абумовіла распаўсюджванне ў нашым рэгіёне пераважна царкоўна-прыходскіх школ і амаль што поўную адсутнасць прафесійных вучэльняў. Гэтыя ж прычыны абумовілі і тое, што на Гродзеншчыне не была праведзена земская рэформа. Менавіта земствы аказалі вялікі ўплыў на развіццё сельскагаспадарчай адукацыі ў многіх раёнах цэнтральнай і паўднёвай Расіі. У выніку ўсіх гэтых працэсаў наш край у гэтым кампаненце значна саступаў амаль што ўсім часткам Расійскай імперыі.

Аднак на пачатку XX ст. сітуацыя ў гэтай сферы змянілася. На тэрыторыі тагачаснай Гродзенскай губерніі быў дадзены старт цэламу комплексу мерапрыемстваў, накіраваных на ўдасканаленне асноўных накірункаў вядзення сельскай гаспадаркі і агранамічную асвету саміх сялян. Як нам падаецца, падобная актыўнасць з боку царызму, у першую чаргу, была звязана з ажыццяўленнем разнастайных мерапрыемстваў у межах сталыпінскай аграрнай рэформы. Важная роля ў пераліку гэтых захадаў адводзілася стварэнню ўзорных гаспадарак, закладцы вопытных палёў, адкрыццю вучэбных устаноў аграрнага профілю, заснаванню пракатных пунктаў, арганізацыі сельскагаспадарчых таварыстваў розных узроўняў, прапагандзе ідэй кааперацыі і г. д. Істотным чыннікам на шляху павышэння сельскагаспадарчай адукаванасці мясцовага насельніцтва, на думку ўладаў, павінна была стаць арганізацыя сельскагаспадарчых курсаў, а таксама розных чытанняў і гутарак адпаведнай накіраванасці.

Першыя ўзгадкі аб правядзенні адмысловых сельскагаспадарчых курсаў для мясцовага сялянства датуюцца 1909 г. Тады пры Краснастоцкім жаночым манастыры (Сакольскі ўезд) былі наладжаны трохтыднёвыя бясплатныя курсы для ўсіх жадаючых па жывёлагадоўлі і малочнай гаспадарцы [1, а. 404]. Дарэчы, гэтая рэлігійная ўстанова на



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

пачатку XX ст. адыгрывала адметную ролю ў справе распаўсюджвання агранамічных ведаў у маштабах усёй Гродзенскай губерніі. Дзейнасць манахінь і ігуменні ў гэтым кірунку мела даволі шырокі рэзананс, аб чым, між іншым, сведчыць артыкул у сталічным “Пецярбургскім лістке” ад 13 студзеня 1910 г. [2, а. 20] У наступныя гады падобная практыка працягвался, вынікам чаго стала заснаванне на базе гэтых курсаў адмысловага сельскагаспадарчага жаночага вучылішча ў 1911 г. [3, а. 1]

У 1911-1914 гг. правядзенне рознага кшталту агранамічных курсаў і чытанняў для сялян Гродзенскай губерніі паступова набывае больш ці менш сістэматычны характар. Асноўным ініцыятарам правядзення адукацыйных мерапрыемстваў падобнага кшталту выступала Гродзенская ўправа земляробства і землекарыстання звычайна ў асобе губернскага агранома. Варта адзначыць, што рэгіянальныя сельскагаспадарчыя таварыствы, якія з’яўляліся недзяржаўнымі арганізацыямі і мелі куды большы вопыт, дадзены накірунак асветніцкай дзейнасці амаль што цалкам ігнаравалі.

Аналіз справаздач па гэтым прадмеце за розныя гады дазваляе вылучыць асноўную тэматыку, падрабязны змест, час, сацыяльны і асабісты склад слухачоў, а таксама некаторыя іншыя аспекты, звязаныя з арганізацыяй і правядзеннем узгаданых курсаў. Што тычыцца тэматычнай скіраванасці, то яны ахоплівалі розныя сферы сельскай гаспадаркі: пчалярства, садоўніцтва і агародніцтва, жывёлагадоўлю, ветэрынарыю і малочную гаспадарку, лугаводства і, канечне, асновы паляводства. Ёсць звесткі аб тым, што сярод іншага, уладамі былі прадпрыняты спробы наладзіць для беларускіх сялянаў чытанні па кошыкапляценню [4, а. 14].

Звычайна падобныя курсы былі разлічаныя на тэрмін ад 10 дзён да трох тыдняў і праводзіліся ў перыяд найменшай гаспадарчай актыўнасці ў цыкле селянскіх работ (канец восені – пачатак вясны). Як правіла, яны ладзіліся на базе нейкай навучальнай установы. Зыходзячы з заяўленай тэматыкі тых ці іншых курсаў у далейшым распрацоўвалася праграма, якая ахоплівала шырокі спектр розных сельскагаспадарчых навук. Так, курсы па паляводстве, садаводстве і агародніцтве, што праводзіліся на базе Азярніцкай пачатковай сельскагаспадарчай школы з 9 па 20 снежня 1913 г. ўключалі заняткі па наступнай тэматыцы: “Аб сялянскай гаспадарцы і яе паляпшэнні. Як хутараніну арганізаваць сваю гаспадарку. Як жыве і чым харчуецца расліна”, “Глеба і ўгнаенне. Апрацоўка глебы”, “Аб ачыстцы насення і аб пасеве”, “Харчовыя буракі, морква, рэпа, турнепс, бульба … проса”, “Вучэнне аб севазвароце. Аб сельскагаспадарчым таварыстве”,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

“Пладовы гадавальнік”, “Пчалярства”, “Пабудова вулляў. Як хадзіць за пчоламі” і г. д.

Варта адзначыць, што, акрамя тэарэтычнай часткі, падобныя курсы, што вельмі важна, амаль заўсёды мелі і практычную частку. Паколькі правядзенне такіх заняткаў на полі ў той час не ўяўлялася магчымым, то яны ўключалі ў сябе такія віды дзейнасці, як вывучэнне пабудовы розных сельскагаспадарчых машын (радавай сеялкі, плугоў розных мадыфікацый і вытворцаў і г. д.), знаёмства з методыкай падліку неабходнай колькасці фосфарных і калійных угнаенняў (улічваючы прыроднае насычэнне глебы аксідам фосфара $P_2O_5$ і аксідам калія $K_2O$), вызначэнне ўсходжасці насення, практычнае азнаямленне са спосабамі прышчаплення дрэў, фармавання кароны пладовых саджанцаў у залежнасці ад іх узросту і г. д. [5, а. 15]. Дзеля большай нагляднасці выкладчыкі ў працэсе навучання выкарыстоўвалі разнастайныя наглядныя матэрыялы: табліцы, гербарыі, калекцыі сельскагаспадарчых шкоднікаў, угнаенняў, мадэлі вулляў і г.д. Да “інавацыйных” тэхналогій таго часу можна аднесці выкарыстанне лектарамі праекцыйнага апарату (іншая назва – туманныя адбіткі). Адзначым, што кошт такой навамоднай рэчы (разам з наборам адпаведных дыпазітываў) у той час складаў каля 175 руб. [6, а. 27]. Куплялі такія апараты за мяжой.

Звяртае на сябе ўвагу і яшчэ адна досыць цікавая акалічнасць, а менавіта дыферэнцыяцыя ў аплаце працы выкладчыкаў. Яна вар’іравалася ў залежнаці ад тыпу заняткаў. Пры гэтым заробак лектара у 1,5-2 разы перавышаў тую суму, якая выплочвалася за вядзенне практычных заняткаў (1 гадзіна лекцыі – 5 руб., а практыкі 3 руб., альбо адпаведна 3 руб. і 1,5 руб.).

Па традыцыі тых часоў любая афіцыйная падзея (у тым ліку і курсы) распачыналася з імшы. Сама вучоба адбывалася ўвечары. Асноўнымі наведвальнікамі падобных курсаў былі сяляне таго населенага пункту, дзе размяшчалася школа. Аднак пры спрыяльным надвор’і на лекцыі хадзілі ўсе жадаючыя з навакольных вёсак. Акрамя сялян, на занятках прысутнічалі асобы іншых сацыяльных і прафесійных груп: святары, настаўнікі, дарожныя майстры і іншая вясковая інтэлігенцыя. Як вынікае са справаздач выкладчыкаў, асноўны катынгент наведвальнікаў можна падзяліць на тры групы: а) актыў, які прысутнічаў на ўсіх занятках; б) асобы, якія хадзілі на заняткі толькі той тэматыкі, што іх цікавіла; в) выпадковыя цікаўныя [5, а. 31]. Напрыклад, колькасць слухачоў курсаў у сяле Трасцяніцы (Кобрынскі ўезд) вар’іравалася ад 50 да 120 чалавек.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Многія ўдзельнікі курсаў і рознага кшталту агранамічных чытанняў падкрэслівалі, што заняткі не абмяжоўваліся выключна выкладаннем тэорыі. Важную ролю ў падобных мерапрыемствах адыгрываў дыялог, дыскусіі, спрэчкі, якія суправаждалі ці не кожны занятак. Яно і зразумела чаму. Звыклыя да традыцыйных метадаў вядзення гаспадаркі, беларускія сяляне з вялікім недаверам ставіліся да ўсіх новаўвядзенняў.

Іншай формай пазашкольнай аграрнай адукацыі на Гродзеншчыне ў той час з'яўляліся чытанні і гутаркі. У адрозненні ад курсаў, чытанні мелі менш працяглы тэрмін правядзення, звычайна ад 4 да 6 дзён. Меншай была і колькасць іх наведвальнікаў. Але па сваёй арганізацыйнай структуры яны амаль што не адрозніваліся ад курсаў. У сваю чаргу, гутаркі ўяўлялі сабой звычайны лекцыйны занятак па тым ці іншым актуальным пытанні. Пад час заняткаў сялянам раздавалі літаратуру сельскагаспадарчай накіраванасці.

У сваіх паведамленнях многія лектары рабілі спробу ацаніць практычны эфект правядзення курсаў, чытанняў ці гутарак у той ці іншай мясцовасці. У справаздачах яны неаднаразова падкрэслівалі, што пасля заканчэння заняткаў сяляне звярталіся да іх з просьбамі выпісаць тое ці іншае насенне, угнаенне, дрэвы, дапамагчы з адкрыццём пункту праката сельскагаспадарчай тэхнікі і г. д. У некаторых выпадках пад уплывам праведзенай працы сяляне мянялі традыцыйную форму гаспадарання і нават пераходзілі да кааперацыі [7, а. 11]. Яшчэ адным вынікам падобнай асветніцкай дзейнасці можна лічыць той факт, што выпускнікоў сельскагаспадарчых курсаў у хуткім часе сталі браць на пасады ніжэйшага агранамічнага персанала ў розных мясцовасцях Гродзенскай губерні [8, а. 27]

Аднак, аналізуючы агульныя вынікі ўсёй праграмы пазашкольнай аграрнай адукацыі на Гродзеншчыне, неабходна адзначыць, што ў цэлым яна не аказала якога-небудзь адчувальнага ўплыву на сістэму вядзення сельскай гаспадаркі ў нашым краі. Прычына гэтага відавочная. Распачатая ў 1914 г. вайна скасавала ўвесь той пазітыўны эфект, які пачаў вызначацца на шляху мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі Гродзеншчыны на пачатку XX ст.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна. Ф. 88, воп. 1, спр. 205.
2. НГАБ у Гродне. Ф. 18, воп. 2, спр. 213.
3. НГАБ у Гродне. Ф. 31 воп. 1, спр. 813.
4. НГАБ у Гродне. Ф. 85 воп. 2, спр. 1226.
5. НГАБ у Гродне. Ф. 361, воп. 1, спр. 18.
6. НГАБ у Гродне. Ф. 31, воп. 5, спр. 17.
7. НГАБ у Гродне. Ф. 31, воп. 1, спр. 1214.
8. НГАБ у Гродне. Ф. 868, воп. 1, спр. 29.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ